УДК 821.161.3.09

# ПОСТАЦЬ ПЛАТОНА НА СТАРОНКАХ ЛІРЫКІ МАКСІМА ТАНКА

***Д. А. Карытка*** (МДУ імя А. А. Куляшова)
Навук. кіраўнік ***Т. І. Борбат***,
канд. філалаг. навук, дацэнт

Цяжка знайсці паэта такой энцыклапедычнай дасведчанасці, як М. Танк. Ужо з самага пачатку дыяпазон яго творчых арыенціраў пашыраўся і ўзбагачаўся за кошт звароту творцы да сусветнага мастацкага



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

вопыту. Настаўнікамі, аднадумцамі паэта становяцца славутыя асобы Антычнасці: Гамер, Платон, Арыстоцель, Дыяген, Авідзій і іншыя.

Разважаючы пра спецыфіку мастацкай творчасці, месца і ролю паэта ў грамадстве, М. Танк звяртаўся да вопыту і высноў Платона. Патрабавальнасцю да паэзіі як да своеасаблівай формы прамаўлення ісціны вызначаецца асоба М. Танка. Як і Платон, вызначальнымі для творчасці паэт лічыў талент, напружаную працу і духоўнае самаахвяраванне.

Думкі і развагі Платона – сярод творчых арыенціраў М. Танка. Яны часта выступаюць у ролі фундамента ўніверсальнага мастацкага мыслення паэта. Так, у запісной кніжцы маладога Танка, паводле «Лісткоў календара», была занатавана цытата з Платона: «Перад вялікім паэтам станем на калені, як перад з'явай рэдкай, светлай і цудоўнай, але не дазволім яму застацца сярод нас» [1, с. 143].

Выгнаннікамі становяцца паэты ў ідэальнай дзяржаве, вобраз якой створаны Платонам у яго філасофскіх трактатах «Дзяржава» і «Законы». Паводле яго вучэння, мастацтва павінна быць большым, чым копія. Але глыбокая праўда не патрэбна «неідэальным» уладарам дзяржавы.

Філасофскія высновы Платона М. Танк праецыруе на сучаснасць: *«Па тым, што нас, паэтаў, // Не выганяюць, а нат запрашаюць // На розныя фэсты, // Урачыстасці, юбілеі, // Мяркую, паводлуг Платона, // Што мы яшчэ жывём // Не ў ідэальнай дзяржаве»* [2, с. 252].

Ідэальная дзяржава, распазнаўшы сапраўдны сэнс творчасці паэтаў (і М.Танка, і яго паплечнікаў), выгнала б іх. Значыць, дзяржава, як апарат падаўлення індывідуальнай волі, варожая паэтычнай дзейнасці. Верш прымушае паразважаць пра маральны статус творчага чалавека. Раз запрашаюць – значыць, мы ліслівім, ману выдаем за праўду. Крывадушша садзейнічае стварэнню літаратуры нізкага мастацкага ўзроўню.

Такім чынам, з вобразам Платонам М.Танк звязвае вырашэнне праблемы адказнасці мастака перад творчасцю, маральнага і духоўнага аблічча паэта.

**Літаратура**

1. Танк, М. Лісткі календара / М. Танк. – Мінск : Беларусь, 1970. – 312 с.
2. Танк, М. Збор калосся : Вершы / М. Танк. – Мінск : Маст. літ., 1989. – 301 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова